# ПРЫМЕТНІК

Першы ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце прыметнікі:
1) дзвесце;
2) пазалеташні;
3) двухмесячны;
4) учора;
5) воўчы.

**А2.** Адзначце якасныя прыметнікі:
1) фіялетавы;
2) жончын;
3) дарослы;
4) вараны (конь);
5) драўляны.

**А3.** Адзначце прыметнікі, ужытыя ў вышэйшай ступені параўнання:
1) найвесялейшы;
2) большы;
3) самы чароўны;
4) менш складаны;
5) мацнейшы.

**А4.** Адзначце прыметнікі, якія ўтвараюць ступені параўнання:
1) пясчаны;
2) сярэбраны;
3) вясёлы;
4) службовы;
5) чысты.

**А5.** Адзначце прыметнікі, якія ў форме давальнага склону адзіночнага ліку маюць канчаткі - ***аму*** **(-** ***ому*****)** :
1) рыжы;
2) дарагі;
3) позняя;
4) палявое;
5) віцебская.

**А6.** Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:
1) матуліна;
2) восеньскі;
3) палымянны;
4) чмялінны;
5) снежаньскі.

**А7.** Адзначце правільна напісаныя складаныя прыметнікі:
1) трохметровы;
2) дрэва-апрацоўчы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) стогадовы;
4) высакапробны;
5) ваенна-ўліковы.

**А8.** Адзначце прыметнікі, утвораныя суфіксальным спосабам:
1) звышмагутны;
2) ультракароткі;
3) праўдзівы;
4) бульбяны;
5) дзіцячы.

**Частка В**

Знайдзіце ў сказе кароткі прыметнік і запішыце яго.

*Калі ўзяўся за гуж, не кажы, што нядуж.*
□□□□□□□□□□□

Другі ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце адносныя прыметнікі:
1) пяцітонны;
2) сумленны;
3) Міхасёў;
4) вячэрні;
5) вучэбны.

**А2.** Адзначце спалучэнні, у якіх адносныя прыметнікі ўжыты ў значэнні якасных:
1) лёгкая прамысловасць;
2) жалезная воля;
3) залатое лісце;
4) мяккі зычны;
5) дубовы стыль.

**А3.** Адзначце прыметнікі, якія ў простай форме вышэйшай ступені параўнання маюць суплетыўныя асновы:
1) малы;
2) добры;
3) белы;
4) дрэнны;
5) блізкі.

**А4.** Адзначце якасныя прыметнікі, якія зусім не ўтвараюць ступеней параўнання:
1) стромкі;
2) халасты;
3) цёмна-чырвоны;
4) барадаты;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) радасны.

**А5.** Адзначце прыметнікі, якія ў форме роднага і творнага склонаў адзіночнага ліку маюць варыянтныя канчаткі:

1) сёлетняя;

2) мілы;

3) густыя;

4) летняе;

5) сакавітая.

**А6.** Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:

1) купецкі;

2) кандыдатскі;

3) гарадскі;

4) таварыскі;

5) страшэны.

**А7.** Адзначце правільна напісаныя складаныя прыметнікі:

1) дабрасумленны;

2) прыродна-гаспадарчы;

3) новагруцкі;

4) кісла-салодкі;

5) паўночна-заходні.

**А8.** Адзначце прыметнікі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:

1) авечы;

2) надвоблачны;

3) блішчасты;

4) падаконны;

5) адзіны.

**Частка В**

Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі прыметнікамі і іх сінтаксічнай роляй у сказе. Адказ запішыце.

А. У квецені рушыць **маладая** вясна.
Б. Усходы жыта **густыя**.
В. Госцю я заўсёды **рад**.

1. Дапаўненне.
2. Акалічнасць.
3. Азначэнне.
4. Іменная частка выказніка.
5. Выказнік.

□□□□□□□□□□□

Трэці ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце прыналежныя прыметнікі:

1) сельскі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) птушыны;
3) Аленчын;
4) дзядзькаў;
5) керамічны.

**А2.** Адзначце спалучэнні, у якіх прыналежныя прыметнікі ўжыты ў значэнні адносных:
1) сабаліная шапка;
2) арліны погляд;
3) брылёўскі твор;
4) мележаўскі стыль;
5) салдацкія боты.

**А3.** Адзначце спалучэнні з правільна ўжытымі прыметнікамі:
1) вышэйшы брата;
2) малодшы сяржант;
3) маладзейшы за сястру;
4) вялікшы, чым дрэва;
5) старшыя класы.

**А4.** Адзначце якасныя прыметнікі, якія ўтвараюць толькі складаныя формы ступеней параўнання:
1) працяглы;
2) васільковы;
3) гняды;
4) гераічны;
5) неабсяжны.

**А5.** Адзначце прыналежныя прыметнікі, якія ў вінавальным склоне адзіночнага ліку маюць кароткую форму:
1) дзедаў (унук);
2) Васева (радасць);
3) маміна (сястра);
4) бацькаў (брат);
5) бабуліна (цяля).

**А6.** Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:
1) славакскі;
2) каўкаскі;
3) Чэрвеньскі (раён);
4) казанскі;
5) нясвіжскі.

**А7.** Адзначце правільна напісаныя складаныя прыметнікі:
1) Паўднёва-Кітайскае (мора);
2) граматамны;
3) паўднёваафрыканскі;
4) 13-павярховы;
5) перадцянь-шанскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А8.** Адзначце прыметнікі, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:

1) жыццярадасны;
2) буйнаблочны;
3) вечназялёны;
4) мелкаводны;
5) самаадвольны.

## Частка В

Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікамі і спосабамі іх утварэння. Адказ запішыце.

| | |
|---|---|
| А. Высокакваліфікаваны. | 1. Асноваскладанне. |
| Б. Прысядзібны. | 2. Словаскладанне. |
| В. Чатырохкласны. | 3. Прыставачны. |
| Г. Светла-зялёны. | 4. Прыставачна-суфіксальны. |
| Д. Інтэрнацыянальны. | 5. Складана-суфіксальны. |

□□□□□□□□□□

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ